ВЕРА КАСАП

# Абмяркоўваем праблемы падрыхтоўкі кадраў

**1 лютага 2000 года ў Беларускім універсітэце культуры прайшоў круглы стол па праблемах вышэйшай бібліятэчнай адукацыі, арганізаваны ў адпаведнасці з рашэннем калегіі Міністэрства культуры Беларусі ад 28 кастрычніка 1999 г. У аргкамітэт па яго падрыхтоўцы ўвайшлі Міністэрства культуры, Нацыянальная бібліятэка, Беларускі універсітэт культуры.**

Вельмі прадстаўніча выглядала зала паседжанняў універсітэта. Тут былі прадстаўнікі Міністэрства культуры, Беларускага інстытута праблем культуры, абласных упраўленняў культуры, дырэктары і намеснікі буйных бібліятэк г. Мінска і абласных бібліятэк, Нацыянальнай кніжнай палаты, газеты "Культура", а таксама выкладчыкі і аспіранты Беларускага універсітэта культуры і Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума.

Праблемы падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў былі прадметам абмеркавання на розных канферэнцыях, семінарах, старонках прафесійнага друку. Гэты круглы стол у адрозненне ад іншых мерапрыемстваў праводзіўся на пераломным этапе развіцця бібліятэчнай справы, калі набірае моц аўтаматызацыя бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, узрастаюць патрабаванні карыстальнікаў да атрымання якасных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг, павялічваецца роля бібліятэк як цэнтраў арганізацыі вольнага часу насельніцтва. У адпаведнасці з гэтым змяняюцца патрабаванні і да падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, іх кваліфікацыі, уменняў, ведаў, навыкаў. У новай культуралагічнай і эканамічнай сітуацыі неабходна вызначыць, якія спецыялізацыі найбольш запатрабаваны на бібліятэчным рынку працы.

Улічваючы рэальнасці сённяшняга дня ў Беларускім універсітэце культуры робіцца нямала: распрацаваны і зацверджаны Міністэрствам адукацыі стандарты на агульнанавуковыя і агульнапрафесійныя дысцыпліны; распрацаваны стандарты на дысцыпліны спецыялізацый, якія прайшлі экспертызу ў бібліятэках і зацверджаны кіраўніцтвам універсітэта. У межах круглага стала былі заяўлены да абмяркавання наступныя пытанні:

— сучасны стан, праблемы, тэндэнцыі і перспектывы вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

— кадравае забеспячэнне бібліятэк розных тыпаў;

— стандарты бібліятэчнай адукацыі.

У прывітальным слове да ўдзельнікаў круглага стала прарэктар па вучэбнай рабоце, доктар культуралогіі прафесар А.І. Смолік звярнуў увагу на састаў удзельнікаў нарады, паведаміў аб тым, што робіцца ва ўніверсітэце для актуалізацыі навучання будучых спецыялістаў бібліятэчнай сферы, аб кадравым патэнцыяле выкладчыкаў факультэта, аб распрацоўцы імі значных праблем бібліятэчнай дзейнасці.

У.А. Шышкін, намеснік начальніка аддзела ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры зазначыў, што бібліятэкі складаюць 52% устаноў культуры, але апошнія гады іх колькасць скарачаецца. Спыніўшыся на дасягненнях бібліятэк краіны, ён даў характарыстыку кадравага саставу бібліятэк. У публічных бібліятэках 71,6% складаюць спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Назіраецца тэндэнцыя да зніжэння колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у Магілёўскай і Гомельскай абласцях. У рэспубліканскіх навуковых бібліятэках толькі 68,2% працуючых маюць базавую бібліятэчную адукацыю. 23% бібліятэкараў маюць узрост звыш 50 гадоў. Між тым было адзначана, што попыт на спецыялістаў перавышае магчымасці выпуску. Так у мінулым навучальным годзе закончылі універсітэт 70 чалавек, а заявак ад бібліятэк было пададзена 166.

Былі вызначаны прыярытэтныя накірункі падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй:

— навучанне новым інфармацыйным тэхналогіям (рабоце ў лакальных і глабальных камп"ютэрных сетках);

— адкрыццё новых спецыяльнасцей і спецыялізацый;

— распрацоўка канцэпцыі бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі і адпаведных вучэбных планаў;

— падрыхтоўка кадраў павінна весціся з улікам запатрабаванняў і змен сацыяльна-дэмаграфічнай сітуацыі, спецыфікі розных відаў і тыпаў бібліятэк.

Дэкан факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры, кандыдат педагагічных навук Р.С.Матульскі спыніўся на асаблівасцях і праблемах развіцця вышэйшай бібліятэчнай адукацыі на Беларусі. Ён зрабіў агляд сістэмы бесперапыннай адукацыі ў галіне бібліятэчнай справы на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. Падрыхтоўка студэнтаў ажыццяўляецца па 10 спецыялізацыях:

— па тыпах бібліятэк (навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі);

— па відах дакументаў (старажытная і рэдкая кніга);

— па функцыянальнай спецыялізацыі (АБІС);

— па спецыялізацыі на базе іншай спецыяльнасці (бібліятэказнаўства, бібліяграфія і беларуская мова; кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю).

Існуе праграма паскоранай падрыхтоўкі спецыялістаў. Найбольш папулярнымі сярод абітурыентаў з'яўляюцца спецыялізацыі "Бібліятэказнаўства, бібліяграфія і замежная мова", "Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы".

Адзначалася, што набор студэнтаў на факультэт не забяспечвае патрэбнасці бібліятэк рэспублікі ў кваліфікаваных кадрах. Так у 1990 г. на 1-шы курс было прынята толькі 40 студэнтаў на 5-гадовы тэрмін навучання і 20 студэнтаў — на скарочаны. У 1998—1999 гг. — 65 студэнтаў на асноўныя спецыялізацыі і 20 студэнтаў на скарочаны тэрмін навучання.

Загадчыкі кафедраў ФБІС: доктар педагагічных навук, прафесар В.Е.Лявончыкаў, кандыдат педагагічных навук М.А.Яцэвіч, кандыдат гістарычных навук У.А.Акуліч пазнаёмілі прысутных з асаблівасцямі распрацоўкі, мэтамі, патрабаваннямі да ведаў, уменняў, навыкаў і зместам стандартаў на дысцыпліны спецыялізацый. Было падкрэслена, што ўсе стандарты прайшлі экспертызу ў бібліятэках рэспублікі, ў выніку якой былі выказаны прапановы па іх удасканаленню і паглыбленню ведаў у вызначаных накірунках.

Л.Г.Кірухіна, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прысвяціла выступленне кадраваму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забеспячэнню публічных бібліятэк. Было адзначана, што публічныя бібліятэкі краіны маюць вострую патрэбнасць у кваліфікаваных кадрах. Цяпер назіраецца высокая цякучасць кадраў у публічных бібліятэках Гомельскай, Гродзенскай, Віцебскай абласцей.

Назіраецца старэнне кадравага саставу бібліятэк: супрацоўнікі са стажам працы звыш 15 гадоў складаюць 62%. Напачатку 2000 г. ў публічных бібліятэках рэспублікі было звыш 200 вакантных месцаў, сярод іх — у аддзелах абслугоўвання, бібліятэчнага маркетынгу, аўтаматызацыі. Зараз неабходна весці падрыхтоўку спецыялістаў універсальнага профілю па абслугоўванню карыстальнікаў у бібліятэках розных тыпаў. Падрыхтоўка менеджэраў бібліятэчнай справы павінна насіць штучны характар.

Р.Н.Сухарукава, дырэктар Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі, звярнула ўвагу на падрыхтоўку кадраў для навукова-тэхнічных і спецыяльных бібліятэк. У другой палове 90-х гг. больш за 30% бібліятэкараў навукова-тэхнічных бібліятэк не мелі спецыяльнай адукацыі. Разам з тым у 1995, 1996, 1997 гг. у Беларускім універсітэце культуры не было набору на спецыялізацыю "навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі". Былі выказаны прапановы па паляпшэнню навучання студэнтаў:

— патрэбна пашырыць веды па сучасных праблемах прыродазнаўства, тэхнікі і звязаных з імі галін;

— звяртаць увагу на асаблівасці абслугоўвання новых катэгорый карыстальнікаў бібліятэк, напрыклад, прадстаўнікоў сферы бізнесу;

— узмацніць падрыхтоўку па класіфікацыі дакументаў па УДК і класіфікацыі Д'юі;

— арганізаваць у БУК падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі работнікаў інфармацыйных службаў.

К.К.Слуцкая, намеснік дырэктара Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэкі, прааналізавала дынаміку развіцця кадравага складу РНМБ і бібліятэк медыцынскай сеткі. Назіраецца змяншэнне колькасці спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Была выказана прапанова па больш актыўнаму прыцягненню ў якасці бібліятэкараў студэнтаў БУК старэйшых курсаў на 1/2 стаўкі, а ў раённых бібліятэках — студэнтаў-завочнікаў, якія не працуюць у бібліятэках пастаянна. Неабходна таксама стварыць кірмаш бібліятэчных вакансій ў Інтэрнэце.

А.В.Шамелава, дырэктар Рэспубліканскай навуковай педагагічнай бібліятэкі, адзначыла рэзкае змяншэнне колькасці выпускнікоў, якія прыходзяць у бібліятэку. Неабходна, на яе думку, павышэнне якасці набору тых, хто паступае на факультэт.

В.А.Тамашэва, намеснік дырэктара цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі, падкрэсліла, што цяпер у дзіцячых бібліятэках не хапае спецыялістаў з веданнем беларускай мовы, замежных моў, а таксама праграмістаў.

Т.П.Муха, дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі, востра паставіла пытанне аб фарміраванні і напаўненні спецыялізацый на ФБІС згодна патрэбнасцям бібліятэк. Выказвалася прапанова па ўдакладненню спецыялізацыі " менеджэр бібліятэчнай справы".

А.І.Сцепанцоў, дырэктар БелІПК, выказаў прапанову па паскоранай перападрыхтоўцы спецыялістаў без бібліятэчнай адукацыі на базе БелІПК, абласных упраўленняў культуры і абласных бібліятэк. Гэта будзе не другая спецыяльнасць, а перападрыхтоўка кадраў.

М.А.Яцэвіч выказаў сумненні наконт дыплома гэтых спецыялістаў. Ён прапанаваў праводзіць падрыхтоўку і перападрыхтоўку спецыялістаў па накіраваннях з бібліятэк у Беларускім універсітэце культуры. Было пастаўлена пытанне аб арганізацыі факультэта паслядыпломнай адукацыі.

Т.М.Сакалова, намеснік дэкана факультэта завочнага навучання БУК, паведаміла аб асаблівасцях навучання студэнтаў-завочнікаў. Размеркаванне на спецыялізацыі тут адбываецца на 4—5-х курсах. Узмацненню спецыяльнай падрыхтоўкі спрыяюць курсы па выбару, колькасць якіх плануецца павялічыць.

В.П.Дуброва, дырэктар Гомельскай абласной бібліятэкі, параўнала кадравы састаў бібліятэк Бранскай і Гомельскай абласцей, якія знаходзяцца на забруджаных тэрыторыях. У Гомельскай вобласці назіраецца значны недахоп бібліятэчных кадраў, а ў Бранскай — усе вакансіі заняты. Трэба шырэй праводзіць рэкламныя кампаніі па прыцягненню маладых людзей да паступлення ў БУК.

П.М.Лапо, дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, прапанаваў укараніць замежную форму навучання студэнтаў, пры якой вызначаецца пералік курсаў, абавязковых і дадатковых. Кожны курс атрымлівае адзнаку ў балах. Студэнтам неабходна набраць адпаведную колькасць балаў за тэрмін навучання.

У.А.Голубеў, дырэктар Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі, вызначыў ролю адукацыйных стандартаў і прапанаваў распрацаваць стандарт на перападрыхтоўку бібліятэчных кадраў. Ініцыятарам гэтай працы магла б стаць Беларуская бібліятэчная асацыяцыя. Ён падтрымаў ідэю М.А.Яцэвіча аб тым, што перападрыхтоўку бібліятэчных кадраў трэба ажыццяўляць у Беларускім універсітэце культуры.

## ПАСТАНОВА

З мэтай удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйных устаноў рэспублікі ўдзельнікі круглага стала па праблемах вышэйшай бібліятэчнай адукацыі прынялі наступныя рэкамендацыі:

1. З мэтай задавальнення патрэбнасцей бібліятэк у высокакваліфікаваных кадрах прасіць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь павялічыць набор на першы курс ФБІС БУК мінімум на 20 чалавек.

2. ФБІС БУК, бібліятэкам рэспублікі ўзмацніць прафарыентацыйную работу сярод выпускнікоў школ. На сустрэчы з імі запрашаць выкладчыкаў БУК і вядучых спецыялістаў бібліятэк.

3. Для эфектыўнага размеркавання выпускнікоў ФБІС працягваць накіраванне студэнтаў на практыку па папярэдніх заяўках з бібліятэк. Студэнтаў 5-га курса накіроўваць на практыку з улікам будучага месца працы і спецыялізацыі.

4. Для забеспячэння вывучэння студэнтамі нацыянальных праграмных прадуктаў і баз даных прасіць вядучыя бібліятэкі на спонсарскіх умовах перадаць для выкарыстання ў вучэбным працэсе на кафедру АБІС БУК неабходныя базы даных, праграмы ці іх дэманстрацыйныя версіі.

5. Для стварэння рэзерву навуковых супрацоўнікаў бібліятэк і выкладчыцкіх кадраў ФБІС БУК і бібліятэкам рэспублікі актывізаваць працу па падрыхтоўцы ў аспірантуры і дактарантуры БУК навуковых кадраў з ліку супрацоўнікаў бібліятэк, маючых здольнасці да навуковых даследаванняў і практычны вопыт.

6. Прасіць Міністэрства культуры вывучыць пытанне аб павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў інфарма цыйных устаноў, а таксама бібліятэкараў без спецыяльнай вышэйшай адукацыі на базе ФБІС БУК.

7. Хадайнічаць перад Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй аб распрацоўцы стандарта па перападрыхтоўцы бібліятэчных кадраў.

**SUMMARY**

On 1 February 2000 the round table of high library education was held in Belarus University of Culture. The organizers of conference were the Ministry of Culture, National Library of Belarus, and Belarus University of Culture. About 50 experts from 20 libraries, Ministry of Culture and Mogilev library school has taken part in work of the round table.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ